[5] Maciejewska I. // Pamętnik Literacki. 1958. № 1.
[6] Потебня А. Эстетика и поэтика. М., 1976. С. 449.
[7] Pług A. Kłosy z rodzinnej niwy. Wilno, 1856. S. 7. (пераклад наш—М. Х.)
[8] Pług A. Zagon rodzinny. Wilno, 1854. S. 9.
[9] Ibid. S. 135.

А. Г. ЛІТВІНОЎСКАЯ

БЕЛАРУСКІЯ ЛІЧЫЛКІ. ПЕРШАСНАЯ СТРУКТУРА ТЭКСТУ І ШЛЯХІ ЯЕ ЗАЦЯМНЕННЯ

Лічылкі вядомыя дзецям большасці народаў свету. Поруч з вершамі, калыханкамі, дражнілкамі, прыпеўкамі лічылачныя тэксты з'яўляюцца самастойным фальклорным жанрам, які ўяўляе для знаўцаў фалькларыстыкі, этнаграфіі і філалогіі вялікую каштоўнасць. Інтарэс да гэтага жанру праяўляюць польскія, балгарскія, рускія навукоўцы, якія прысвячаюць працы гэтаму пытанню. Беларускія ж лічылкі фактычна аказаліся адсунутымі на перыферыю навуковых даследаванняў. Нам здаецца, прыйшоў час звярнуць увагу і на гэтыя шырока распаўсюджаныя дзіцячыя вершыкі, якія маюць надзіва доўгую і цікавую гісторыю. Да таго ж, дзякуючы працам вядомых этнографаў 19 ст. (Доўнар-Запольскі, Раманаў, Дземідовіч) і сучасным запісам фалькларыстаў, мы маем магчымасць пазнаёміцца з вялікай і разнастайнай спадчынай нашага народу. Самы багаты збор беларускіх лічылак на наш час змяшчаецца ў акадэмічным выданні «Дзіцячы фальклор»[1], а таксама ў зборніку «Беларускі фальклор у сучасных запісах: традыцыйныя жанры»[2].

Адным з найбольш цікавых пытанняў пры вывучэнні лічылак у лінгвістычным аспекце з'яўляецца пытанне генэзісу жанру і рэканструкцыя першаснай структуры лічылачнага тэксту.

Лічылкі, як і большасць іншых жанраў дзіцячага фальклору, не з'яўляюцца прадуктам дзіцячай супольнасці, а прыйшлі з жыцця, абрадаў і вераванняў дарослых. Мяркуецца, што першыя лічылкі паходзяць ад старажытных лічылачных магічных формул і ўяўляюць сабою элементарны пералік. Аб такіх продках гавораць рудзіменты старажытных вераванняў, якія захаваліся ў сучасных лічылках, напр., табуізаваныя лічэбнікі тыпу **азі, двазі, трызі** і г. д. Як сцвярджае рускі даследчык дзіцягача фальклору В. Анікін[3], збіраючыся на паляванне ці на які іншы промысел, першабытныя людзі пры дапамозе пераліку вызначалі ролі ў паляванні ці месцы рыбнай лоўлі. З язычніцкіх часоў вядомы лічбы шчаслівыя (тры, сем) і нешчаслівыя (трынаццаць). Чалавек, на якога выпадала нешчаслівая лічба, не павінен быў удзельнічаць у промысле, таму што ён мог загубіць усю справу. Размеркаванне ж роляў пры дапамозе лічылкі быццам бы не залежыла ад чалавечай волі. Гэта быў лёс, выпадак, з якім немагчыма спрачацца. Зыходзячы з гэтага можна лічыць, што формула пераліку мела магічную, звышчалавечую сілу. А табуізацыя лічэбнікаў адбывалася таму, што нашыя продкі верылі ў здольнасць птушак, рыб, жывёл, духаў прыроды ўсё чуць і разумець, і, каб падмануць іх, захаваць у таямніцы свае прыгатаванні да палявання, людзі прыдумалі замяняльнікі лічэбнікаў.

На карысць магічнай функцыі пераліку гаворыць таксама тое, што ён у старажытныя часы выкарыстоўваўся з мэтай вызначэння ахвяры. Напр., кожны дзесяты палонны, абраны пры дапамозе пераліку, прызначаўся для ахвярапрынашэння як падзяка багам за перамогу. Такім жа чынам выбіраліся ахвяры сярод свойскай жывёлы.

Водгалас гэтых першабытных вераванняў можна знайсці і ў больш блізкія часы. Польскі вучоны Крысціна Пісаркова прыводзіць тэкст лічылкі, запісаны ў канцы 19 ст. у Варшаве, пры дапамозе якой сярод правініўшыхся хлопчыкаў выбіралі аднаго, які павінен быў выкупіць калектыўную віну[4]. Верагодна, што і расстрэл фашыстамі кожнага дзясятага (або сотага) у другую сусветную вайну меў тыя ж карані.

Такім чынам, можна меркаваць, што першасная структура лічылкі ўяўляе сабой элементарны пералік. Да гэтага часу ў розных народаў вядомы выпадкі, калі ў якасці лічылкі дзеці выкарыстоўваюць голы пералік (вон, напр., выходзіць кожны пяты, дзесяты, пятнаццаты і г. д.). Калі паглядзець на сучасныя лічылкі, тэзіс аб такой першаснай структуры можа падацца даволі дзіўным, таму што толькі частка з іх мае элементы пераліку. Але затое такія лічылкі, як сцвярджае В. Анікін, утвараюць сабой ядро гэтага жанру і існуюць ва ўсіх народаў Еўропы і Азіі[5]. Чаму ж менавіта пералік? Відаць, таму, што пералік адпавядае асноўнай функцыі лічылкі — размеркаванню роляў і чарговасці ў гульні. Прычым тут мае значэнне і рытмічная структура пераліку, калі кожны націскны элемент суправаджаецца жэстам у бок чарговага ўдзельніка гульні. Але сустракаюцца і лічылкі тыпу: *Раз, два, тры, чатыры, пяць — Я іду шукаць,* для якіх галоўнай з'яўляецца мнематэхнічная функцыя, або функцыя вымярэння часу[6]. Мэта такіх лічылак— адмерыць час, дастатковы, напр., для таго, каб усе паспелі схавацца пры гульні ў хованкі, але такія лічылкі складаюць даволі малую групу.

Выкарыстанне ў лічылках незразумелых элементаў (табуізаваных або запазычаных слоў) не дазваляе прадказваць вынікі пераліку, што для гульні з'яўляецца вельмі істотным.

Але, як ужо адзначалася вышэй, далёка не ўсе лічылкі захавалі сваю першасную структуру. У большасці з іх яна змянілася. Паспрабуем вызначыць шляхі змянення і развіцця першаснай структуры лічылак. Яны падаюцца нам наступнымі:

1. Скажэнне лічэбнікаў чужых моў. Адбываецца таму, што чужыя словы незразумелыя дзецям. Параўнай: **Энэ, дуэ, рэс, квантэр, квінтэр, жэс** з лацінскімі лічэбнікамі **unus** ('адзін'), **duo** ('два'), **tres** ('тры'), **quattuor** ('чатыры'), **quinque** ('пяць'), **sex** ('шэсць'), ад якіх, хутчэй за ўсё, утварылася лічылка[7].

2. Дэфармацыя лічэбнікаў пад уплывам рыфмы. Вядома, што ў розных мовах частка лічэбнікаў мела ўнутраную першасную рыфму, якая, магчыма, дапамагала кансервацыі лічэбнікавай сістэмы (напр., у бел. **тры чатыры, сем восем** і г. д.). Мабыць, пад уздзеяннем гэтай рыфмы і адбылося змяненне нерыфмаваных лічэбнікаў. Напр., на месцы **энэ дуэ** з'явілася пара **энэ бэнэ**, дзе элемент **бэнэ** ўжо не мае ніякага дачынення да лацінскай сістэмы лічэння, а выступае ў якасці рыфмовачнага.

Па той жа мадэлі, на наш погляд, утварыліся і наступныя пары: **кунтэр мунтэр** > **quattuor** (лац. — 'чатыры'); **шэндэр мэндэр** > **шондра** (мова афеняў — 'шэсць'); **энтэл пэнтэл** > **ain** (з ням. праз ідыш —'адзін').

Цікавы вынік даў аналіз наступнай лічылкі: *Адзін трыгадзін —Трацан парыцан — П'яда лада — Сукма дукма — Дывер дыксер — Зай!*

Параўнаўшы гэтую лічылку з цыганскай сістэмай лічэння, атрымаем наступнае: **трацан парыцан** > **trajce** ('тры'); **п'яда лада** > **piedzin** ('пяць'), **lodzin** ('шэсць'); **сукма дукма** > **zukman** ('сем'), **dukman** ('восем'); **дывер дыксер** > **diwcl** ('дзевяць'), **dikse** ('дзесяць').

3. Спецыялізацыя лічылак. Узнікненне формул ці асобных слоў, якія адпавядаюць той ці іншай гульні. Пры гульні ў жмуркі, напр., даволі распаўсюджана наступная лічылка і яе варыянты: *Цынцу вальнцу —Пятаму ладаму — Сікус брыкус — Радзівон, выдзі вон!* Пры дапамозе яе дзеткі лічацца, каму жмурыцца. Той, на каго прыйдзецца апошняе слова лічылкі **вон!**, выходзіць.

4. Кантамінацыя або спалучэнне лічылкі з іншым паэтычным тэкстам (часта з тэкстам іншай лічылкі):

Раз, два, тры, чатыры, пяць,
Шэсць, сем, восем, дзевяць, дзесяць,
Цар вялеў мяне павесіць,
А царыца не дала
І павесіла цара.
Цар вісеў, вісеў, вісеў
І ў памыйку ўляцеў.
А ў памыйцы жыў Барыс,

Прадсядацель дохлых крыс,
А жана яго Ларыса —
Прадсядацельская крыса[8].

Перад намі спалучэнне фрагментаў лічылкі і шырока вядомай на Беларусі дражнілкі на хлопчыка па імені Барыс і дзяўчынку Ларысу.

Існуе шэраг сюжэтных лічылак, якія ўвогуле ў сваёй структуры не маюць лічэбнікаў. Большасць з гэтых лічылак з'явілася хутчэй за ўсё ў выніку запазычання тэкстаў з іншых фальклорных і літаратурных жанраў (песень, вершаў, скарагаворак і інш.), або была створана на аснове фальклорных сюжэтаў:

Ой, рабіны, рабіны галамузы,
Нашы кабылкі нядужы.
Гэтую кабылку зарэжце,
А з спіны — драбіны,
А з трыбухоў — пярыны,
А з галавы — фанары,
А з капытоў — кубкі,
А з галёнкаў — крупкі.

Гэта дражнілка, якая вымаўляецца нараспеў, парадзіруючы малітоўны стыль, на Віцебшчыне выкарыстоўваецца ў якасці лічылкі[9].

Такім чынам, відавочна, што сучасныя лічылкі маюць працяглую гісторыю і, як і ва ўсіх астатніх фальклорных жанраў, у іх ёсць свая спецыфічная структура. У адпаведнасці з размеркавальнай функцыяй усе лічылкі можна падзяліць на дзве групы:

А. Уласна лічылкі, для якіх функцыя размеркавання роляў і чарговасці ў гульні з'яўляецца першаснай:

Раз, два — рукава,
Тры, чатыры — нос у чарніле,
Пяць, шэсць — кашу есць,
Сем, восем — сена косім,
Дзевяць, дзесяць — Мішу павесіць.

Б. Рыфмаваныя тэксты, якія выкарыстоўваюцца ў якасці лічылак. Для іх функцыя размеркавання роляў звычайна з'яўляецца другаснай:

Дура баба, дурны дзед,
Хапіліся — хлеба нет,
Запраглі барана,
Паехалі да пана.
Пана дома не знайшлі,
Вараціліся назад,
Зачапіліся за пень,
Прастаялі цэлы дзень.

Гэта песенька дзецьмі выкарыстоўваецца ў якасці лічылкі.

Існуе шэраг агульных рыс, характэрных як для першай, так і для другой групы лічылак, што тлумачыцца, у першую чаргу, асноўнай функцыяй гэтага жанру.

1. Усе лічылкі — гэта вершаваныя тэксты, якія маюць строгую рытмічную структуру.

2. Лічылачныя тэксты маюць абмежаваны аб'ём (мінімум — два радкі, максімум — дваццаць радкоў). Аптымальны аб'ём лічылачнага тэксту — прыблізна чатыры — восем радкоў. Відавочна, што занадта кароткія тэксты знаходзяцца ў супярэчнасці з адной з асноўных задач лічылкі — непрадказальнасцю канчатковага выніку, а занадта доўгія тэксты збыткоўныя.

Для нас, зразумела, большую цікавасць уяўляюць уласна лічылкі, якія, у сваю чаргу, маюць шэраг структурных асаблівасцей: а) наяўнасць элементаў падліку ў пачатку, радзей, сярэдзіне тэксту; б) наяўнасць сюжэтных фрагментаў; в) наяўнасць націскнога заключнага элемента, у якасці якога могуць ужывацца займеннікі, выклічнікі, семантычна няясныя словы тыпу **клец, коч**, спецыялізаваныя формулы тыпу **Радзівон, выдзі вон!**

На аснове ўстаноўленых асаблівасцей можна прадставіць структуру сучаснай лічылкі ў найбольш абагуленым выглядзе наступным чынам:

1 2 3 4 5
№1 №2 №3 №4 №5
№ !..,

дзе 1, 2, ..., 5 — элементы пераліку; № 1, № 2, ..., № 5 — сюжэтныя фрагменты; № ! — заключны націскны элемент. Дадзеная схема можа рэалізоўвацца ва ўсечаным выглядзе, можа мець варыянты.

Такім чынам, як ужо адзначалася вышэй, сучасная лічылка першага тыпу — гэта звычайна вынік трансфармацыі і развіцця першаснай структуры лічылачнага тэксту, якая ўяўляла сабой элементарны пералік.

Цікава было б, на нашу думку, параўнаць увесь шэраг разнастайных формаў лічылак, якія нарадзіліся з цягам часу ў беларускім фальклоры, з лічылкамі іншых славянскіх народаў.

[1] Дзіцячы фальклор. Мн., 1972. С. 393 і наст.
[2] Беларускі фальклор у сучасных запісах: традыцыйныя жанры. Гомельская вобласць. Мн., 1989. С. 330.
[3] Аникин В. Русские народные песни, пословицы, поговорки, загадки и детский фольклор. М., 1957. С. 113 і наст.
[4] Pisarkowa Kr. Wyliczanki polskie. Wrocław; Warszawa; Kraków; Gdańsk, 1975. S. 9.
[5] Аникин В. Указ. раб. С. 113.
[6] Pisarkowa Kr. Wyliczanki polskie. S. 11 i nast.
[7] Больш падрабязна аб гэтым гл.: Літвіноўская А. Г. // Весн. Беларус. ун-та. Сер. 4. 1992. № 1.
[8] Дзіцячы фальклор. С. 399.
[9] Там жа. С. 426.

В. В. КАЗНАЧЭЕЎ

АБ НЕКАТОРЫХ АСАБЛІВАСЦЯХ МІФАЛАГІЧНЫХ УЯЎЛЕННЯЎ НАСЕЛЬНІЦТВА ГОМЕЛЬСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Доўгі час у Гомельскай вобласці шырокіх этналінгвістычных, у тым ліку і міфалагічных, даследаванняў не праводзілася. Гэты прабел быў запоўнены толькі ў 1992 г., калі было абследавана 13 населеных пунктаў: вёскі Бабічы, Галоўкі, Капань і Унорыца Рэчыцкага раёна, Бубнаўка Акцябрскага, Добрынь Ельскага, Махнавічы Мазырскага, Перарост Добрушскага, Губічы, Іванаўка і Радзеева Буда-Кашалеўскага раёна, у апошнім раёне апытанні вяліся і сярод перасяленцаў з брагінскіх вёсак Крукі і Спярыжжа.

Калі размова заходзіць аб беларускай і наогул аб усходнеславянскай міфалогіі, у нас не хапае дадзеных, каб разглядаць яе як цэласную карціну свету. Сёння можна разглядаць толькі комплекс пэўных міфалагічных уяўленняў, які ў жорнах гісторыі значна рэдукаваўся. Зараз фіксуюцца толькі рэшткі былой беларускай міфалогіі, што пацвярджаецца параўнаннем сучасных даследаванняў з даследаваннямі XIX —пачатку XX ст. Акрамя таго, мае месца рэгіянальная раз'яднанасць і фрагментарнасць міфалагічных уяўленняў, яны могуць быць рознымі, і часам істотна рознымі, нават у суседніх населеных пунктах. Гэтыя тыповыя для беларускай міфалогіі з'явы назіраюцца і на Гомельшчыне. Тут адзначаецца тое ж кола міфалагічных персанажаў, што і наогул на Беларусі, і прыкладна тая ж ступень іх распаўсюджанасці, аднак у некаторых выпадках іншай з'яўляецца акцэнтуацыя іх акцыянальных характарыстык і функцыянальнай накіраванасці. Так, напрыклад, менш пазітыўным з'яўляецца *дамавік*. Часцей за ўсё ён амбівалентны, і ў залежнасці ад таго, ці да спадобы яму гаспадары хаты, у іх будзе весціся гаспадарка і шанцаваць у справах або наадварот. У в. Махнавічы дамавік— персанаж негатыўны, але ж няздольны на нейкі радыкальны ўплыў на жыццё, і таму ўчыняе дробныя пакасці — перашкаджае сну людзей, мучыць скаціну. Ёсць вёскі, дзе дамавік адназначна станоўчы, але колькасць гэтых вёсак прапарцыянальна значна меншая, чым на Беларусі ў цэлым. І ў пераважнай большасці населеных пунктаў Гомельскай вобласці няма адказаў, што дамавік павінен быць у кожнай хаце, насупраць, толькі ў некаторых, звычайна ў нямногіх, што таксама нельга лічыць агульнапрынятым, прычым нідзе не адзначана заканамернасцяў, паводле якіх дамавік выбірае тую ці іншую хату. Не выключана, што тут меў месца перанос рэдукцыі міфалагічных уяўленняў з іх колькасці і паўнаты на іх семантыку: звужэнне інфармацыі аб дамавіку паўплывала на скарачэнне ягонай, так сказаць, папуляцыі.

Разнастайнасць выгляду дамавіка даволі тыповая. Дамавік антрапа-